Голас Радзімы

№ 51 (1262) СНЕЖАНЬ 1972 г. ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ ГОД ВЫДАННЯ 17-ТЫ ЦАНА 2 КАП.

Масква. Крэмль. Красная плошча. Фота В. ЯГОРАВА.

ПА МАСКОЎСКАМУ ЧАСУ

Кожная раніца нашай рэспублікі пачынаецца з урачыстай і велічнай мелодыі.

«Широка страна моя родная», — даносяцца з Масквы пазыўныя Усесаюзнага радыё. І Беларусь, часцінка агромністай краіны, якая носіць гордае імя СССР, вітае новы дзень.

Кожны новы год мы сустракаем пад бой Крамлёўскіх курантаў — галоўнага гадзінніка нашай дзяржавы. Падымаючы традыцыйны бакал шампанскага за шчасце людское і росквіт Радзімы, беларусы працягваюць руку рускім і казахам, грузінам і украінцам, суседзям-літоўцам і далёкім ад нас кіргізам і таджыкам. І адчуваюць сябе нібы за адным сталом, у дружнай сям'і, якая называецца савецкім народам.

Мы жывём па маскоўскаму часу. Мінск і Масква разам сустракаюць і золак новага дня, і разбег новага года. Паміж сталіцамі Беларусі і Расіі адлегласць у 700 з лішнім кіламетраў. Але гэта не падзяляе нас. У беларусаў шмат агульнага з рускімі: змаганне за сацыяльнае вызваленне і роўнасць, сумесная барацьба супраць фашызму, за нашы агульныя ідэалы, супольная праца дзеля камуністычнай будучыні.

Паўстагоддзя назад у Маскве быў закладзены падмурак трывалага братэрства народаў былой Расійскай імперыі. Мы сталі жыць па новых законах, адкрытых вялікім Кастрычнікам. Зніклі варожасць і падазронасць адной нацыі да другой, малога народа да вялікага. Іх замянілі шчырасць і супрацоўніцтва, дружба і ўзаемная павага. Мы лепш пазналі адзін аднаго; вопыт, дасягненні і набыткі адной нацыі сталі адкрытымі і даступнымі для астатніх нацый. Разам нам па сіле тое, што ніколі не адолець паасобку.

Думаючы аб гэтым, мы думаем пра Маскву, якая адыграла вялікую ролю ў гістарычным лёсе Беларусі. Калі беларусы, галодныя і ў большасці непісьменныя, у разбураным войнамі і разрабаваным няпрошанымі гаспадарамі краі пачыналі будаваць новае жыццё, у сэрцах людзей жыла вера, што выбраны імі шлях прывядзе да лепшай долі. Верылі таму, што разам з намі была Масква. Адтуль па распараджэнню Леніна прыйшла эканамічная дапамога маладой савецкай рэспубліцы Беларусі. Адтуль ехалі вучоныя, каб выкладаць у першым беларускім універсітэце. Адтуль прыбывала ў знясіленыя хваробамі і забабонамі глухія беларускія вёскі медыцынская дапамога.

Масква — значыць Расія, неабсяжныя абшары Савецкага Саюза. Калі гітлераўскія орды дратавалі Беларусь, мы чуйна прыслухоўваліся, як б'ецца сэрца краіны. Фронт каціўся ўсё далей на ўсход. Вораг пускаў дымам нашы вёскі і гарады, адпраўляў на шыбеніцу і за калючы дрот канцэнтрацыйных лагераў нашых людзей. І кожны патрыёт-беларус з трывогай і надзеяй думаў: «Выстаіць Масква, Расія—значыць будзе жыць і Беларусь».

Тры доўгія гады акупацыі Беларусь жыла весткамі з Масквы.

«Говорит Москва!

От Советского Информбюро...»

Гэтыя словы прагна лавілі ў лясной зямлянцы партызаны. Іх тайком слухалі ў няскораным Мінску падпольшчыкі. Весткі з Масквы патрэбны былі партызанам і падпольшчыкам, каб чэрпаць новыя сілы для барацьбы. Іх яшчэ больш чакала насельніцтва, бо амаль з кожнай хаты там, на фронце, ваяваў муж ці сын. Весткі з Масквы цаніліся даражэй за хлеб надзённы, які так рэдка бачылі на стале ў час вайны. Масква дапамагла беларусам выжыць, пазбегнуць нацыянальнага знішчэння і перамагчы.

Масква — тое галоўнае звяно, якое яднае нас з усімі народамі Савецкага Саюза. Мы не цураемся свайго, нацыянальнага, але ніколі не замыкаемся толькі ў сваім. Калі б мы выбралі шлях нацыянальнай замкнёнасці, Беларусь, напэўна, напаткаў бы лёс тых дзяржаў, якія ляжаць воддаль ад імклівых трас нашага касмічнага стагоддзя.

Мара паэта — напісаць першую кніжку, гонар — быць выдадзеным у Маскве. На беларускай мове яго вершы прачытаюць толькі ў сваёй рэспубліцы. У перакладзе на рускую творчасць літаратара становіцца даступнай усім. Для кампазітара прыемная нечаканасць, калі ён сустракаецца са сваёй песняй за сотні кіламетраў, у якой-небудзь прыпяцкай ці наддзвінскай вёсцы. Але яшчэ большая радасць, калі беларуская песня ўсхвалюе жыхароў далёкаўсходняга гарадка ці каўказскага аула. Гастролі беларускіх опернага ці драматычнага тэатраў у сталіцы — свята для творчага калектыву, бо выступаць у Маскве — значыць заваяваць прызнанне ўсёй краіны.

Для Беларусі, як і для іншых рэспублік, Масква — гэта арэна, ступіўшы на якую ты бачыш усіх і цябе заўважаюць усе. Мы не можам і не хочам жыць па законах нацыянальнай абмежаванасці: усё наша — толькі нам. Мы — інтэрнацыяналісты і таму шчодра дзелімся ўсім, што маем, і адчуваем такую ж братэрскую шчодрасць з боку іншых народаў СССР.

У Маскве мы бываем кожны дзень. Едзем па справах і проста ў госці. Жывыя сувязі, што лучаць Мінск з Масквой, ніколі не парываліся. Драматург спяшаецца на генеральную рэпетыцыю сваёй п'есы, якую паставіў маскоўскі тэатр. Інжынер адпраўляецца ў камандзіроўку наладжваць мінскую электронна-вылічальную машыну, што закупіў маскоўскі завод. Студэнт, правёўшы канікулы ў маці на Брэстчыне, едзе на заняткі ў маскоўскі інстытут.

Такая ж сувязь дзейнічае і ў адваротным напрамку.

У Маскве мы на кожным кроку сустракаемся з Беларуссю, і таму адчуваем сябе, як дома. Можна купіць білет і пайсці ў Крамлёўскі тэатр, сцэна якога стала сваёй для народных тэатраў Беларусі. Можна пабываць на прэм'еры новай кінастужкі «Беларусьфільма» або на сустрэчы беларускага пісьменніка з маскоўскімі чытачамі. А хто хоча ўбачыць Беларусь больш шырока і шматгранна, той знойдзе яе на Усесаюзнай выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі.

Вечарам мы абавязкова прыходзім на Красную плошчу, каб разам з масквічамі і кіяўлянамі, талінцамі і ташкентцамі, жыхарамі Запаляр'я і Крыма пастаяць ля Маўзалея Леніна, убачыць, як змяняецца ганаровая варта, паслухаць, як пачынаюць перазвон куранты. Тут, на гэтым месцы, мы нібы рэальна адчуваем тую нябачную мяжу, за якой сучаснасць становіцца гісторыяй, а будучыня— сучаснасцю.

...Гадзіннік Савецкай дзяржавы адбівае першыя імгненні новых сутак. Бой Крамлёўскіх курантаў плыве над Краснай плошчай, над Масквой. Яго чуюць у Мінску і Брэсце, у маладым Новалукомлі і тысячагадовым Тураве. Яго чуюць у кожнай савецкай рэспубліцы. Бо ўсе мы жывём па маскоўскаму часу — часу вялікіх рэвалюцыйных перамен, часу будучыні чалавецтва.

Агульная гандлёвая плошча новага універсальнага магазіна Магілёва складае каля чатырох з палавінай тысяч квадратных метраў. 300 прадаўцоў-кансультантаў і касіраў абслугоўваюць у ім наведвальнікаў. Для зручнасці пакупнікоў ва ўсіх трох гандлёвых залах уведзена самаабслугоўванне, працуюць радыёвузел, бюро добрых паслуг, якое прымае заяўкі па дастаўцы тавараў на дом. НА ЗДЫМКУ: у адным з аддзелаў новага універмага.

Фота М. ЖАЛУДОВІЧА.

МТЗ-50 У ГДР

На Мінскі трактарны завод прышло пісьмо з ГДР ад трактарыста міжкааператыўнага аб'яднання палявых культур «Рынглебен» з акругі Гале Зігфрыда Швесера.

«Дарагія трактарабудаўнікі Мінска! — піша нямецкі механізатар.— Ужо сем гадоў я ваджу зроблены вамі трактар «Беларусь» МТЗ-50. Без перавелічэння скажу, трактар мяне ніколі не падводзіў. І калі б хто прапанаваў мне сёння змяніць яго на іншы, такой жа магутнасці, я б гэтага не зрабіў. Такой жа думкі прытрымліваецца і мой калега Карл Баўман. Я ўпэўнены, што і іншыя 1 780 трактарыстаў нашай акругі Гале, якія водзяць трактары вашага завода, зрабілі б тое ж самае».

Зігфрыд Швесер адпрацаваў на першым трактары «Беларусь» 5 200 вытворчых гадзін і быў прызнаны лепшым механізатарам ГДР. Цяпер ён перасеў на другую машыну і ўжо давёў выпрацоўку да 4 тысяч гадзін, а матор яшчэ ў поўным парадку.

ПЛЮС ГРАМАДСКАЯ ПРАФЕСІЯ

Факультэт грамадскіх прафесій з шасцю аддзяленнямі адкрыўся ў Маладзечанскім палітэхнікуме. Разам з асноўнай спецыяльнасцю яго выпускнікі набудуць веды і навыкі ў бібліятэчнай справе, атрымаюць права працаваць аператарамі тэхнічных сродкаў навучання і лічыльнай тэхнікі, грамадскімі інструктарамі па розных відах спорту.

МАЦНЕЮЦЬ КАНТАКТЫ

Ерэванскі аўтамабільны завод узводзіўся не толькі рукамі армян. Яго будавалі рускія, украінцы, беларусы, латышы... Метал завод атрымлівае з РСФСР і з Украіны, а некаторыя дэталі для зборкі кузаваў спачатку пастаўляў БелАЗ. Цяпер выпуск гэтых дэталей наладзілі ў Ерэване і пачалі забяспечваць імі іншыя рэспублікі.

Мацнеюць кантакты калектываў Ерэванскага і Беларускага аўтазаводаў. Напрыклад, аддзел галоўнага канструктара ЕрАЗ спаборнічае з такім жа аддзелам Беларускага аўтазавода.

ШЧАСЛІВАГА ПЛАВАННЯ!

14 снежня, ўрачыста ўзняўся Дзяржаўны сцяг на новым цеплаходзе, які носіць імя народнага песняра Янкі Купалы. Цеплаход пабудавалі на Навамышскім суднабудаўнічым заводзе «Ака» для Дунайскага параходства нашай краіны.

Цяпер, пасля ўзняцця сцяга, судна гатова выйсці ў Чорнае і Міжземнае моры, дзе яно будзе несці сваю асноўную службу.

ВЫЙШЛА Ў ВЫДАВЕЦТВЕ «НАВУКА І ТЭХНІКА»

У выдавецтве «Навука і тэхніка» выйшла ў свет кніга «Беларусь у саюзе савецкіх рэспублік». Яна створана калектывам аўтараў — вучонымі, партыйнымі і савецкімі работнікамі, якія прысвяцілі сваю працу 50-годдзю ўтварэння Савецкага Саюза.

На вялікім фактычным матэрыяле ў кнізе асвятляецца станаўленне беларускай савецкай дзяржаўнасці, прааналізаваны эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя здзяйсненні, якія адбыліся з часу яе ўступлення ў саюз брацкіх народаў. Дасягнутыя рэспублікай поспехі — плён узаемнай бескарыслівай дапамогі народаў СССР. Цэментуючай сілай непарушнага адзінства сацыялістычных нацый, падкрэсліваюць аўтары, з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза.

У кнізе даецца адпор спробам ідэолагаў імперыялізму сказіць і фальсіфікаваць гісторыю, нацыянальную палітыку партыі, прынізіць міжнароднае значэнне ўтварэння шматнацыянальнай сацыялістычнай дзяржавы.

АДРАС—НАБЯРЭЖНЫЯ ЧАЎНЫ

Чарговую партыю абсталявання для КамАЗа — чатыры цяжкія падоўжна-апрацоўчыя станкі вырабіў калектыў Мінскага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Станкі атрымалі добрую ацэнку прыёмнай камісіі, у саставе якой былі і прадстаўнікі Камскага аўтазавода.

«БЕЛАРУСЬ» НА КАЎКАЗЕ

На беразе Чорнага мора размясціўся піянерскі лагер «Беларусь». Гэта летняя здраўніца дзяцей баранавіцкіх тэкстыльшчыкаў.

Цікавая гісторыя яе стварэння. Неяк на Баранавіцкім баваўняным камбінаце гасцілі ўдзельнікі вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў абхазцы Георгій Канджалія і Валерыян Шорыя. Госці з Абхазіі тады і прапанавалі ў адной са школ адкрыць на летнія канікулы піянерскі лагер для дзяцей тэкстыльшчыкаў. І вось ужо трэці год на Чарнаморскім узбярэжжы Каўказа паблізу Сухумі дзейнічае дзіцячая здраўніца камбіната. Толькі сёлета тут правялі летнія канікулы 320 школьнікаў.



Хутка ўвойдзе ў дзеянне пяты энергаблок на Лукомскай ДРЭС. Гэта буйнейшая электрастанцыя ў Беларусі. НА ЗДЫМКУ: мантаж лініі электраперадач на Лукомскай ДРЭС.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

БЕЛАРУСЬ НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ
агляд навін

Беларусь і Францыя. Сувязь паміж імі рознабаковая і пастаянная. Абмен турысцкімі групамі, дружба гарадоў-пабрацімаў Жодзіна — Венісье і Орша—Вазанвіль, няспынная работа Беларускага аддзялення Таварыства «СССР—Францыя», якім кіруе народны пісьменнік БССР Іван Мележ.

Нядаўна з Парыжа з XVII сесіі генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКО вярнулася дэлегацыя БССР. Узначальваў яе міністр вышэйшай і сярэдняй адукацыі Мікалай Мяшкоў. На канферэнцыі разглядаліся пытанні аб павышэнні ролі ЮНЕСКО ў справе барацьбы за мір. Нашы дэлегаты выступалі з дакладамі і прапановамі.

Днямі Беларуская рэспубліка прымала дэлегацыю Таварыства «Францыя—СССР», якая гасціла тут. Кіраўнік дэлегацыі прафесар Сарбоны Ражэ Парталь пасля некалькіх дзён знаёмства з рэспублікай сказаў: «Беларусь, што атрымала свабоду ў выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі, шчасліва жыве ў Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, які гарантуе ёй раўнапраўе і развіццё эканомікі і культуры».

Праграма ў французскіх сяброў у час іх знаходжання ў Беларусі была шырокай і разнастайнай. У Мінску яны зрабілі паездку па горадзе, азнаёміліся з яго славутымі мясцінамі, новымі раёнамі, пабывалі ў музеі Вялікай Айчыннай вайны, дзе ўбачылі матэрыялы і экспанаты, якія расказваюць аб гераічнай барацьбе беларускага народа і аб французскіх патрыётах, што змагаліся на тэрыторыі Беларусі. Госці з Францыі пабывалі ў Мінскім педагагічным інстытуце замежных моў, у Таварыстве дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, на камвольным камбінаце, у Саюзе пісьменнікаў і ў Палацы піянераў і школьнікаў.

Вельмі цёплымі і сардэчнымі былі сустрэчы французскай дэлегацыі ў Жодзіна, дзе створана гарадское аддзяленне Таварыства «СССР—Францыя». Зноў экскурсія па горадзе, на Беларускі аўтамабільны завод, зноў знаёмствы і сустрэчы з савецкімі людзьмі.

У Брэсце госці агледзелі мемарыяльны комплекс, экспазіцыю музея абароны цытадэлі, з цікавасцю пазнаёміліся з матэрыяламі, якія расказваюць аб удзеле байцоў легендарнага гарнізона ў французскім руху Супраціўлення.

ДЫРЭКТАР РАІЦЦА З РАБОЧЫМІ

Прызнацца, дырэктар Мінскага тонкасуконнага камбіната Юрый Варанцоў крыху здзівіўся, пачуўшы пытанне аб тым, як складаюцца яго ўзаемаадносіны з рабочымі.

— Якія ж яны могуць быць, калі свой працоўны шлях я сам пачынаў таксама рабочым, слесарам. Быў і рамонтнікам прадзільных машын і памочнікам майстра. Пасля заканчэння тэхнікума, а потым завочнага інстытута працаваў начальнікам цэха, кіраўніком тэхнічнага аддзела.

Так, перш чым стаць дырэктарам, Юрый Фёдаравіч прайшоў школу рабочай загартоўкі і лічыць, што без цеснага супрацоўніцтва адміністрацыі з рабочымі не можа быць добра наладжанай вытворчасці.

На пытанне, у чым жа праяўляецца на камбінаце гэтае супрацоўніцтва, ён адказаў:

— Перш за ўсё ў тым, што ні адна справа, якая датычыць вытворчай дзейнасці ці сацыяльна-культурных мерапрыемстваў, не вырашаецца без удзелу рабочых. Іх прадстаўнікі абавязкова прысутнічаюць на ўсіх штотыднёвых аператыўных нарадах. Рабочыя шырока праяўляюць творчую ініцыятыву. Напрыклад, наша ткачыха Варвара Саламаха, імя якой зараз вядома на ўсю рэспубліку, падлічыла, што за кошт выкарыстання рэзерваў на ўсіх вытворчых аперацыях яна можа выканаць свой пяцігадовы план за чатыры гады і 5 месяцаў. Гэтую ініцыятыву падтрымалі ўсе рабочыя.

Праз партыйную, прафсаюзную і камсамольскую арганізацыі рабочыя і служачыя ўдзельнічаюць у складанні перспектыўных планаў развіцця вытворчасці, размеркаванні матэрыяльных фондаў і г. д. Усё, што адміністрацыя намячае і робіць на прадпрыемстве, папярэдне атрымлівае згоду рабочых і служачых.

Возьмем, напрыклад, план сацыяльнага развіцця калектыву на пяцігоддзе. Распрацавалі яго нашы эканамісты. Але раней, чым ён быў зацверджаны дырэкцыяй, партыйным, прафсаюзным і камсамольскім камітэтамі, яго абмеркавалі рабочыя ўсіх участкаў і цэхаў. Яны ўдакладнілі план, унеслі ў яго свае папраўкі. Згодна з гэтым планам, выпуск тканін за пяцігоддзе павялічыцца амаль на 45 працэнтаў, а прыбытак у 1975 годзе складзе больш за 10 мільёнаў рублёў. Значна ўзрасце заработная плата рабочых і служачых, асігнуюцца вялікія сродкі на будаўніцтва жылля, культурна-бытавыя і аздараўленчыя мерапрыемствы.

Такі ўдзел рабочых у жыцці прадпрыемства, яго планах дае, на мой погляд, добры плён. Рабочыя адчуваюць сябе сапраўднымі гаспадарамі камбіната. Яны ведаюць: чым лепш наладжана вытворчасць, тым больш карысці атрымае дзяржава ў цэлым, а, значыць, і яны самі. І я не лічу выпадковым той факт, што тры чвэрці нашай заводскай арганізацыі рацыяналізатараў і вынаходнікаў складаюць рабочыя.

— Ці бывае так, што рабочыя крытыкуюць вас?

— Так, я прысутнічаю на ўсіх сходах калектыву: агульных, партыйных, прафсаюзных. Я такі ж радавы член партыі, член прафсаюза, як і ўсе. І таму магу быць падвергнуты крытыцы. А наогул, я лічу, што любая крытыка датычыць і мяне асабіста як дырэктара. І таму кіруюся правілам: заўвагі, недахопы, якія выказваюцца на рабочых сходах, ліквідоўваць неадкладна.

На камбінаце створан мастацкі савет. Уваходзяць у яго 25 чалавек—прадстаўнікі розных службаў, у тым ліку і рабочыя. Савет збіраецца два разы ў квартал і абмяркоўвае новыя ўзоры тканін. Члены савета ўдзельнічаюць у канферэнцыях пакупнікоў, што праводзяцца магазінамі. Цесныя кантакты ў нас і са швейнымі прадпрыемствамі, якія шыюць з нашых тканін свае вырабы.

А вось думка саміх рабочых пра іх узаемаадносіны з дырэктарам, пра ўдзел у кіраванні вытворчасцю. Адзін са старэйшых рабочых камбіната электрык Барыс Бацян гаворыць:

— У нас на камбінаце ўжо многа год існуе пастаянна дзеючая вытворчая нарада, якая разглядае ўсе важнейшыя пытанні жыцця прадпрыемства. Я з'яўляюся яе ўдзельнікам. Са 182 членаў агульназаводскай вытворчай нарады 125 чалавек —рабочыя розных спецыяльнасцей. На яе пасяджэннях прысутнічаюць прадстаўнікі адміністрацыі і прафсаюзнай арганізацыі. Кожны выказвае сваю думку наконт любой праблемы, якая датычыць вытворчасці ці грамадскіх спраў. Так, нядаўна мы абмяркоўвалі пытанне аб выкарыстанні сродкаў аўтаматызацыі і механізацыі. Асабіста я як член нарады пабываў у многіх цэхах, гутарыў з рабочымі, выслухаў іх прапановы па выкарыстанню новай тэхнікі. Потым, зразумела, расказаў аб іх на нарадзе. Усе прапановы, якія паступаюць у ходзе нарады, фіксуюцца ў пратаколе і абмяркоўваюцца. Калі за гэтую прапанову прагаласуе большасць рабочых, яна лічыцца прынятай і набывае сілу закона, абавязковага для кожнага члена калектыву, у тым ліку і для дырэктара.

В. НЯЎЗОРАВА.

СУСТРЭЧЫ Ў СТАЛІЦЫ

У Маскве на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР з 30 лістапада па 4 снежня праходзілі дні Беларускай ССР, прысвечаныя пяцідзесяцігадоваму юбілею ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Аб гэтай падзеі расказвае наш карэспандэнт у ніжэй змешчаных нататках.

Размерана і роўна б'ецца пульс Масквы-сталіцы. Як і штодзень, па яе шырокіх вуліцах, нібы па рэчышчах паўнаводных рэк, цякуць бясконцыя патокі людзей і машын, пераўтвараючыся ў шумлівыя віры на плошчах, у крутыя вадаспады і імклівыя ручаі на станцыях метро. Над вуліцамі-рэкамі зіхацяць крамлёўскія зоркі, расцвітаюць барвы неону. А ў чалавечым моры рускіх галасоў няспынна ўсплёскваюць шматлікія еўрапейскія і азіяцкія мовы. Масква — сталіца інтэрнацыянальная.

У гэтым будзённым рытме ёсць, аднак, і своеасаблівыя прыкметы. Плакаты, пано, транспаранты, аб'явы напамінаюць аб тым, што надыходзіць вялікае свята — пяцідзесяты юбілей Савецкага Саюза. Таму сталіца набыла ўрачысты, святочны каларыт.

Маскоўскія газеты і радыё, Цэнтральнае тэлебачанне клічуць жыхароў сталіцы на Выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі. Сёння там пачынаюцца дні Беларускай рэспублікі. Туды запрашаю я і цябе, мой замежны чытач.

МАСКВІЧЫ І БЕЛАРУСЫ

Спачатку, аднак, заглянем на Беларускі вакзал. Паглядзім, як там, на пероне, масквічы сустракаюць беларусаў.

У мітуслівым людскім натоўпе, сярод вакзальнага гоману і шуму нашу ўвагу прыцягнуць не падобныя на паспешлівых пасажыраў, урачыста спакойныя людзі. Прывабяць нас і гукі духавога аркестра. Гэта прадстаўнікі працоўных сталіцы сустракаюць нашу дэлегацыю.

Вось з поезда «Беларусь», што прыбыў раніцой з Мінска, выходзяць дзяржаўныя дзеячы і рабочыя, калгаснікі і вучоныя, пісьменнікі і артысты. Ім уручаюць кветкі, па-сяброўску паціскаюць рукі. Дэлегацыю вітаюць дырэктар ВДНГ прафесар К. Міхайлаў, першы сакратар Чырвонагвардзейскага райкома партыі Н. Балоцін, рабочы завода «Дынама» В. Ладошын. Іх словы — словы шчырасці і пашаны: «Мы рады вітаць вас, дарагія беларускія браты і сябры, мы сардэчна запрашаем вас быць ганаровымі гасцямі савецкай сталіцы».

Цёплая сустрэча — добры пачатак. Накіруемся ж разам з беларускай дэлегацыяй на Выстаўку, у павільён «Цэнтральны», дзе, згодна з праграмай, адбудзецца адкрыццё дзён Беларускай ССР. Неўзабаве тут пачнецца прэс-канферэнцыя для маскоўскіх журналістаў.

Па радыё гучыць Беларускі дзяржаўны гімн. Пад уздзеяннем урачыстай музыкі ўзнікае думка: «А што мы, беларусы, маглі паказаць на падобнай выстаўцы пяцьдзесят год назад, напярэдадні ўз'яднання ў саюзе савецкіх рэспублік? Аб чым мы маглі расказаць? Бадай, не было чым пахваліцца».

Гэткія думкі з'явіліся, відаць, і ў кіраўніка беларускай дэлегацыі, намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР Ніны Сняжковай. Выступаючы перад журналістамі, яна сказала: «Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі «Известия» пісалі, што прамысловасць Беларусі не мае дзяржаўнага значэння, бо не мае вялікіх прадпрыемстваў — яна з грахом папалам абслугоўвае толькі мясцовы рынак». Праўду пісала газета! У той час Беларусь славілася толькі балотамі, лесам, бульбай ды беспрасветнай галечай. Тое ж, чаго мы дасягнулі, а дасягнулі мы вышынь сучаснага прагрэсу, створана беларускім народам за гады знаходжання ў супольнасці сацыялістычных рэспублік.

Аб усім гэтым і расказвае Ніна Сняжкова. Яна ўсхвалявана гаворыць, што мы горача любім сваю родную Беларусь і любім сваю неабсяжную краіну. Бо зямля беларуская — часцінка вялікай Савецкай Радзімы, наша праца—уклад у сумесную працу савецкага народа, а гісторыя нашай рэспублікі — гісторыя барацьбы ўсіх народаў краіны за лепшае жыццё, за сацыялізм.

Для нас гэта барацьба была надзвычай плённай. У Саюзе Саветаў мы стварылі магутную індустрыю, высокапрадукцыйную сельскую гаспадарку, развілі навуку і культуру. Ці здагадваўся той журналіст з паслякастрычніцкіх «Известий», што праз палавіну стагоддзя Беларусь будзе выпускаць столькі прамысловай прадукцыі, колькі за год яе выпускала ўся царская Расія? Вось якім стымулятарам росту стаў новы грамадскі лад! І рост гэты бачны кожнаму, хто мае вочы: і ў Беларусі, і вось тут, у павільёнах ВДНГ.

Шкада толькі, што абмежаваная газетная плошча не дазваляе перадаць змест усіх выступленняў пра дасягненні рэспублікі — у гэтым сэнсе мая задача непараўнальна цяжэйшая, чым майго ізвесцінскага папярэдніка 50 год назад. Даруй мне за лаканічнасць, чытач. Я толькі нагадаю яшчэ словы Ніны Сняжковай пра тое, што ў Мінску, у Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, залатымі літарамі запісаны імёны 33-х масквічоў — Герояў Савецкага Саюза, якія здзейснілі подзвіг і пралілі сваю кроў, вызваляючы ад фашысцкіх акупантаў Беларусь. А колькі яшчэ сыноў Масквы, вядомых і невядомых герояў, колькі тысяч іх палягло на берагах Дняпра і Нёмана, на палях Міншчыны, у пушчах Палесся? А колькі беларусаў загінула пад Масквой? Так што наша братэрства змацавана агнём і крывёю. Я нагадаю таксама, што сотні вучоных, як, напрыклад, прафесары Красін ці Сеўчанка, тысячы інжынераў, настаўнікаў, урачоў дапамагалі нам будавацца, вучыцца, абжывацца па-новаму, пераносілі цяжкасці і нягоды разам з намі. Так што Масква і масквічы заўсёды з'яднаны з Беларуссю аднымі клопатамі і адзіным лёсам.

Раскажы аб гэтым сваім знаёмым і блізкім, мой суайчыннік і чытач. Раскажы тады, калі там, дзе ты жывеш, пачуеш старыя і абрыдлыя байкі пра «руку Масквы». Ведай: мазолістыя рукі Масквы, інтэлігентныя рукі Масквы, апаленыя порахам рукі Масквы, гэтыя сяброўскія рукі былі, ёсць і будуць заўсёды разам з маімі рукамі, з добрымі рукамі маёй слаўнай Беларусі...

Пойдзем жа з табою далей, мой чытач.

Масквічы сустракаюць дэлегацыю з Беларусі.

Члены беларускай дэлегацыі на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР.

ДЫЯЛЕКТЫКА ДРУЖБЫ

Пойдзем у суседні павільён «Хімія». Дарэчы, ці чуў ты гэткае слова — «хімія» — у той час, калі пакідаў Беларусь і адпраўляўся за акіян? Бадай, не чуў. А зараз вось мы адчынім празрыстыя шкляныя дзверы павільёна і пашукаем што-небудзь «хімічнае» беларускае.

Нават нам, людзям бывалым, тут не лёгка разабрацца. Гэткае багацце мудрагелістых і незразумелых прыбораў, агрэгатаў, апаратаў, дэталей!.. З усёй краіны, з усіх рэспублік. Таму звернемся за тлумачэннем вунь да тых чатырох субяседнікаў.

У іх вельмі ажыўленая размова. Двое, тыя, што ў паліто, пытаюць, двое — распранутыя, значыць, удзельнікі выстаўкі — адказваюць. Апошнія, аказваецца, з Гомеля — тут прадстаўлены Інстытут механікі металапалімерных сістэм Акадэміі навук Беларусі.

Тэхнік-наладчык інстытута Уладзімір Бруянкоў расказвае пра інстытут. Заснаваны ён нядаўна, у 1961 годзе, вось у гэтым старым драўляным доме, што на фатаграфіі ў альбоме. Адзін з яго заснавальнікаў і першы дырэктар—масквіч Уладзімір Белы, цяпер рэктар нядаўна адкрытага Гомельскага універсітэта. Інстытут, у якім зараз сем лабараторый, знаходзіцца, як кажуць, на пярэднім краі сучаснай навукі — яго калектыў займаецца распрацоўкай і ўкараненнем у вытворчасць палімерных і металапалімерных вузлоў, дэталей, матэрыялаў. На стэндах, што перад намі, размешчаны вырабы, выпушчаныя інстытутам: разнастайныя шасцерні, падшыпнікі, дэталі, трубы...

— Наш інстытут, — з гонарам заяўляе Бруянкоў,—з'яўляецца вядучым у краіне ў гэтай галіне навукова-тэхнічнага прагрэсу. Так сказаць, Гомель стаў усесаюзнай сталіцай металапалімераў.

Ганарыцца сапраўды ёсць чым. Вынаходніцтвы, зробленыя ў інстытуце, запатэнтаваны ў многіх высокаразвітых краінах, напрыклад, у ЗША, Францыі, Італіі, Англіі, Бельгіі, Швейцарыі. І не дзіва: у інстытуце многа «светлых галоў». З 56-ці вынаходнікаў, напрыклад, 12 маюць па 10 вынаходніцтваў, а на кожнага навуковага супрацоўніка прыпадае больш чым па два адкрыцці. Выдатны паказчык!

Ці было што падобнае ў Гомелі 50 год назад? Ты, мой чытач, ведаеш, што не было і ў паміне. А зараз Гомелю зайздросціць Парыж. Вось, напрыклад, што гаварыў госць інстытута, дырэктар французскага нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра прафесар Р. Куртэль: «У нас, у Францыі, рыхтуецца да выдання кніга «Парыж у 2000 годзе», у якой ёсць раздзел, прысвечаны будучыні навуковых цэнтраў. У сваім першым інтэрв'ю, якое я дам пасля прыезду ў аэрапорт Арлі, я скажу, што ведаю, якім павінен быць навуковы інстытут 2000-га года. Я наведаў такі інстытут, пазнаёміўся з яго работамі. Але, на жаль, ён знаходзіцца не ў Парыжы, а ў Гомелі».

Што ж, заслужаная ацэнка. Мы не будзем супраць, калі парыжане прыедуць у Гомель павучыцца. Як, напрыклад, прыйшлі павучыцца вось гэтыя два масквічы, што доўга размаўлялі з супрацоўнікам інстытута Эдуардам Канавалавым. Пётр Гусеў і Аляксандр Ліўшыц — галоўны тэхнолаг і канструктар аднаго з маскоўскіх заводаў — завіталі ў павільён «Хімія», каб падрабязна даведацца аб вопыце гомельскіх хімікаў і ўкараніць яго ў вытворчасць. Эдуард Канавалаў не толькі падрабязна адказаў на ўсе іх пытанні, але і з'ездзіў на завод, агледзеў цэхі, даў свае парады. Ён запрасіў масквічоў у Гомель, дзе яны канчаткова дамовяцца аб практычнай дапамозе інстытута ў рэканструкцыі завода.

Такая дыялектыка супрацоўніцтва і дружбы Беларусі з Масквою: спачатку масквіч Уладзімір Белы дапамог стварыць у Гомелі інстытут, а цяпер гамяльчане дапамагаюць маскоўскім прадпрыемствам. Як і прадпрыемствам Урала, Алтая, Беларусі, Украіны, Прыбалтыкі.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Прыём прадстаўнікоў Беларусі ў Пралетарскім райкоме КПСС Масквы.

СУСТРЭЧЫ Ў СТАЛІЦЫ

[Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.].

СКАРГА ДЗЯЎЧАТ

У павільёне «Вылічальная тэхніка» таксама сустракаем прадстаўнікоў Беларусі. Ля навейшага мінскага камп'ютэра ЕС-1020, што экспануецца тут, сядзяць хлопец і дзве дзяўчыны. Знаёмлюся, і яны адказваюць: Таня Слабада, Люда Бачыла і Юрый Іваноўскі — інжынеры Мінскага завода імя Арджанікідзе. Між намі адбываецца размова:

— Як тут выглядаюць нашы камп'ютэры? Ці не горшыя, як у людзей?

— Што вы! Наша ЭВМ вельмі папулярная, — адказвае Таня Слабада. — Яе будуць выпускаць за граніцай — у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы.

— Ад цікаўных адбою няма, —дадае Люда Бачыла. — Усё пытаюць пра канструктыўныя асаблівасці машыны, тэхналогію наладкі, пра адрозненне гэтай мадэлі ад папярэдніх.

— А хто пытае?

— Спецыялісты з маскоўскіх інстытутаў, з міністэрстваў —

Прэс-канферэнцыя ў павільёне ВДНГ «Цэнтральны».

пакупнікі машыны, студэнты, вучоныя з ГДР—многія.

— З вамі прыехаў перакладчык?

— А навошта? Мы самі ведаем нямецкую мову.

— А які інстытут вы канчалі?

— Усе трое — Мінскі радыётэхнічны.

— Мы яго зусім нядаўна скончылі, — удакладняе Юрый Іваноўскі.

«Гэта і па ўзросце вашым відаць», — у думках адзначаю я.

— Ведаеце, ніхто не верыць, што мы—інжынеры,—усміхнуўшыся, скардзіцца адна з дзяўчат. — Надта ж мы маладыя...

Зразумела, у маладосці хочацца быць сталейшым. Але, здаецца мне, гэта скарга дарэмная. Бо самыя дакладныя электронныя машыны на Усесаюзнай выстаўцы, самыя высокаадукаваныя і самыя маладыя па ўзросце спецыялісты каля іх— ці можа быць лепшы паказчык навукова-тэхнічнага прагрэсу сучаснай Беларусі?

БУДЗЬЦЕ СПАКОЙНЫ, ПРАФЕСАР!

Вечарам у гасцініцы «Расія» сустракаю хірурга Паўла Булая — кіраўніка рэспубліканскага апёкавага цэнтра, што размешчаны ў 3-й клінічнай бальніцы Мінска. Прапаную яму:

— Надвор'е добрае — пойдзем прагуляемся ля Масквакі.

— На жаль, не магу, — адказвае ён. — Заўтра ў павільёне «Ахова здароўя» выступаю з дакладам. Трэба падрыхтавацца.

— Дык вы ж, Павел Іосіфавіч, нават калі вас разбудзіць у поўнач, пра лячэнне апёкаў без запінкі раскажаце.

— Так то яно так. Але падрыхтавацца трэба. Хвалююся.

Спачуваю і згаджаюся. Назаўтра прыходжу на Выстаўку слухаць яго даклад.

У павільёне сабраліся маскоўскія ўрачы. Чалавек семдзесят. Дырэктар Беларускага навукова-даследчага інстытута неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі прафесар І. Антонаў расказвае ім пра дасягненні нашай медыцыны. Дасягненні вялікія — любая еўрапейская краіна магла б пазайздросціць у гэтым сэнсе Беларусі, у якой гадоў 50—60 назад людзі найчасцей лячыліся ў знахароў і шаптух. Дырэктар інстытута адзначае, што першымі памочнікамі беларусаў у наладжванні сістэмы аховы здароўя былі маскоўскія, ленінградскія і іншыя рускія спецыялісты і ўрачы. А потым з дакладам пра лячэнне апёкаў выступае П. Булай. Слухаю і адзначаю ў блакноце такое, напрыклад, выдатнае дасягненне нашага апёкавага цэнтра: «Мы зараз выратоўваем хворых, якія раней лічыліся асуджанымі на смерць, — тых, у каго апечана 25 працэнтаў скуры...» Далей ён гаворыць пра новыя метады лячэння...

А можа ты калі-небудзь і сустракаў яго на дарогах Латарынгіі, мой французскі чытач?

Бацька яго, Іосіф Булай, у дваццатыя гады ўцёк ад беспрацоўя з Заходняй Беларусі ў Францыю. Там ён працаваў парабкам і шахцёрам. І там зразумеў, што сына яго напаткае той жа батрацкі лёс. Таму вярнуўся з чужыны ў родную вёску Табалу каля Гродна: калі ўжо і гараваць, дык лепш на Радзіме.

Гараваць, аднак, не прыйшлося. Сын былога эмігранта скончыў медыцынскі інстытут у Мінску і стаў хірургам. У 1958 годзе ён паступіў у аспірантуру. У гэты самы час з Масквы ў Мінск прыехаў прафесар А. Раўноў. Маскоўскі прафесар арганізаваў першы беларускі апёкавы цэнтр, а гродзенскі ўрач неўзабаве атрымаў першую вучоную ступень. Праз пару гадоў рускі прафесар перадаў эстафету маладому беларускаму вучонаму і сам вярнуўся ў Маскву. І вось цяпер Павел Булай выступае перад сваімі сталічнымі калегамі. Мне становіцца зразумелым яго хваляванне напярэдадні: кожны з прысутных добра ведае А. Раўнова і кожны будзе цікавіцца, ці добрага пераймальніка пакінуў у Мінску маскоўскі вучоны. Па дружных апладысментах у канцы даклада разумею, што прафесар можа быць спакойны — справа, пачатая ім, знаходзіцца ў надзейных руках.

РАДАСЦЬ ВІЦЯБЛЯНКІ

Куды бягуць дзяўчаты? Куды спяшаюцца жанчыны? Прыслухаўшыся да іх размовы, разумею, што ў павільён, дзе наладжана выстаўка-агляд тавараў народнага спажывання. Пакуль што там паказваюць моды. Хоць у Мінску на паказ модаў я ніколі не хадзіў і наўрад ці пайду, але тут далучаюся да імклівага натоўпу модніц і цвёрда крочу ў павільён. Моды ж нашы, беларускія!

Не пашанцавала — спазніўся. Вялізная зала набіта людзьмі так, што яблыку няма дзе ўпасці. За масквічамі і не даступіцца. Яны сядзяць у крэслах, стаяць ля сцен, у дзвярах, выцягваюць галовы, каб убачыць дзяўчат і хлопцаў з Мінскага дома мадэлей, якія дэманструюць касцюмы і сукенкі — трыкатажныя і з тканін, міні і максі, дэкальтаваныя і строгія, вячэрнія і будзённыя. Уся гэта тысяча людзей час ад часу ўзрываецца апладысментамі. Значыць, моды прыйшліся па густу. Значыць, у нас, у Беларусі, умеюць ткаць прыгожыя тканіны, выдатны трыкатаж і гэтак жа выдатна шыць.

Пытаю ў начальніка тэхнічнага аддзела Міністэрства бытавога абслугоўвання БССР Франца Мазуркевіча:

— Ці добра выглядаем тут мы, беларусы?

— Можаце пераканацца самі, —паказвае ён на публіку.—Гэткі ж поспех і ў нашых майстроў мастацкіх промыслаў, і ў цырульнікаў, і ў мэбельшчыкаў.

І ён знаёміць мяне з віцебскай закройшчыцай Тамарай Пятніцкай. На твары ў дзяўчыны — поўная гама пачуццяў.

— Што вас так усхвалявала, Тамара?

— Поспех віцебскіх швейнікаў. Я нават не чакала такога гарачага прыёму ў масквічоў. Мадэлі нашага адзення ацэнены надзвычай добра. Нас віншуюць і мінскія кіраўнікі, і работнікі выстаўкі, і маскоўскія спецыялісты. Радасна яшчэ і ад таго, што мне ўпершыню давялося прыехаць у Маскву. Паглядзець на сталіцу...

ДВОЕ З ВОСТРАВА

Ветлівасць і сардэчнасць рускіх людзей ты, напэўна, ведаеш, мой чытач. За некалькі дзён у Маскве мне давялося не раз быць сведкай іх добрых пачуццяў да нас, беларусаў.

...Прытаміўшыся, іду ў кафэ, якое знаходзіцца тут жа, на Выстаўцы. За столікам — двое: муж і жонка. Моўчкі абедаем. Але наша маўчанне цягнецца не доўга, таму што я чую словы свайго суседа, звернутыя да жонкі:

— Папасці б нам з табой, Верачка, у Мінск, Хатынь паглядзець...

Своеасаблівая гаворка сведчыць, што мае суседзі — з поўначы Расіі. Знаёмімся. І праўда, Канстанцін і Вера Чачэніны прыбылі ў Маскву з поўначы— з маленькага астраўка на Белым моры, які называецца Ратбак. Там яны абслугоўваюць маяк. Калі ўлічыць, што астравок маленькі, што ён на Белым моры і што яго насельніцтва складаецца толькі з трох чалавек, то будзе прыемна пачуць такія словы, якія я перадаю са стэнаграфічнай дакладнасцю:

— Мы едзем у Крым на адпачынак. І пачулі ў гасцініцы па радыё, што на ВДНГ прыехалі беларусы. Я і кажу Верачцы:



Мінскія мадэльеры дэманструюць масквічам найноўшыя беларускія моды.

паедзем на Выстаўку. Мы столькі чулі пра Беларусь! Пра вашых партызан. Пра Мінск, такі цудоўны горад, пра Хатынь— помнік, якога нідзе на свеце больш няма. Мы чыталі кнігі вашых пісьменнікаў, у нас, ведаеце, на востраве кніжак многа. Па тэлевізару бачылі вашых алімпійскіх чэмпіёнаў і радаваліся за іх. Я і кажу Верачцы: як хочаш, а на Выстаўку паедзем, там яшчэ больш даведаемся пра Беларусь. Разумееце, нам вельмі цікава, мы абое нарадзіліся і выраслі на Белым моры і, акрамя Масквы і Крыма, больш нідзе ў сваім жыцці не былі. Сёння вось мы і сустрэліся з беларусамі...

Верачка — маленькая прыгожая жанчына — глядзела закаханымі вачыма на свайго мужа, я з асалодай слухаў мілагучную паўночную рускую гаворку, а Канстанцін Фёдаравіч працягваў:

— Моцны вы народ. І мужны народ. Паверце мне, Канстанціну Чачэніну — сыну, унуку, праўнуку і прапраўнуку рускіх маракоў. Мы на Белым моры цаніць людзей умеем...

І развітваючыся:

— Дык вось я і кажу Верачцы: папасці б нам калі-небудзь у Мінск, глянуць на вашу Хатынь. А вы прыязджайце да нас на Белае мора. У нас хоць і маленькі, але вельмі прыгожы востраў.

...Павільён «Савецкая культура». У кіназале паказваюць нейкі фільм. Саджуся. Фільм—беларускі. Мінуты праз тры ён канчаецца, людзі ўстаюць. Пажылая жанчына, якая сядзіць побач, выцірае слёзы і звяртаецца да мяне:

— Спазніліся вы, малады чалавек. Такі быў фільм, такі фільм...

— А пра што?

— Пра Беларусь. Як фашысты мучылі і забівалі іх, беларусаў, як палілі вёскі, як яны пасля вайны адбудавалі свае гарады... Маю дачку старэйшую, Людмілу маю, якая была на фронце медсястрой, параніла ў Беларусі...

— А адкуль вы, скажыце?

— З-пад Курска я. А вы?

— З Беларусі.

— О, сынок! Дык і ты можа ў тым агні гарэў і мучыўся? А скажы мне, ці жыве яшчэ Камінскі — той, што ў Хатыні сына трымае на руках?

КРЭМЛЬ

Мы ідзём да Крамля. Мы, беларусы, нясём вянок вялікаму Леніну. Сярод нас прадстаўнікі ўсіх слаёў грамадства: намеснік старшыні ўрада Ніна Сняжкова і настаўніца Арыядна Казей, слесар Яўген Клімчанка і дырэктар завода Ціверый Захарэнка, аграном Марыя Карповіч і хірург Павел Булай, сакратар ЦК камсамола Беларусі Генадзь Анціпаў і артыстка Тамара Ніжнікава — уся наша вялікая дэлегацыя.

Мы ідзём па Краснай плошчы. Па гэтай плошчы пяцьдзесят год назад ішлі прадстаўнікі Беларусі, каб падпісацца пад Дагаворам аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Таму мы нясём вянок вялікаму Леніну.

Беларусы, якія палавіну стагоддзя назад ішлі ў Крэмль, марылі аб шчасці свайго народа, аб яго дабрабыце, аб сацыяльнай справядлівасці і нацыянальнай роўнасці, аб тым, каб выбрацца з адвечнай цемры. Іх мары збыліся. Мы дасягнулі таго, аб чым нават не маглі марыць. Таму мы ўскладаем вянок да Маўзалея Леніна.

Мы наведваем кватэру-музей, дзе жыў і працаваў Ленін. Глядзім на маленькія сціплыя пакоі, па якіх ён хадзіў, слухаем расказ пра яго характар, звычкі, клопаты аб людзях, пра яго дабрату. Кожны з нас ступае па гэтай кватэры ўрачыста і задуменна. Так мы яшчэ раз выказваем любоў і пашану да найвялікшага правадыра і чалавека — Леніна.

Мы праходзім уздоўж Крамлёўскай сцяны, каб аддаць даніну павагі Варашылаву і Калініну, Свярдлову і Жданаву, Джону Рыду і Сен Катаяме, што пахаваны тут, — усім нязломным змагарам за шчасце людское, за сацыялізм. Мы схіляем галовы перад іх светлай памяццю.

Ад Крамлёўскай сцяны дарога вядзе да Магілы невядомага салдата, дзе гарыць агонь славы. Да магілы савецкага салдата, які аддаў сваё жыццё, абараняючы ад ворагаў справу Леніна, маю і нашу свабоду, Маскву і Мінск, маленькую беларускую вёску і ўсю краіну. Мы знімаем шапкі перад магілай нашага слаўнага салдата і кладзём свой вянок перад Вечным агнём.

Да новай сустрэчы, Масква!

Уладзімір БЯГУН.

Фота А. ЦЕРЛЮКЕВІЧА.

Красная плошча. Вянок на Магілу невядомага салдата.

Moscow, the capital of the USSR

THE history of Moscow is rooted in the hoary past—it is 825 years old, but never before has our capital witnesed such a scope and scale of construction as had been performed in the recent years. The 24th CPSU Congress set the task of turning Moscow into a model communist city. A General Plan for its development has been endorsed. Quite recently, on June 16 this year, the CPSU Central Committee and the USSR Council of Ministers carried a decision, «On the five-year plan for the comprehensive development of industry and the municipal economy of Moscow for 1971—1975».

There were good prerequisites for the adoption of the comprehensive plan. 2,700,000 sq m of industrial floor space was put into service in Moscow in the course of the 8th Five-Year Plan (1966—1970) alone. 26,000,000 sq m of housing, i.e., more than 570,000 flats, were built. 2,500,000 Muscovites obtained better housing facilities.

An even greater amount of capital construction has been planned for Moscow in the present five-year period (1971—1975). The state is allocating 12,700 million roubles, including 8,800 million roubles for the development of the municipal economy — or 1,500 million roubles more than in the previous five-year period — for this purpose.

The new plan for the comprehensive development of industry and the capital's municipal economy is an important component of the General Plan, calculated for 25—30 years. Both plans give primary attention to the further development of industry, which is the major factor in the city's construction.

A feature of Moscow's development is the building up, first and foremost, of the industries that call for highly-skilled labour — precision engineering, instrument making, radioengineering, electronics and electrical engineering, and the branches which produce high-quality consumer goods.

The programme provides for the establishment of 65 production zones in the city, based on the existing groups of industrial projects so as to achieve a better and more rational siting of plants and factories. This will make it possible to amalgamate a number of enterprises into homogenous production groups. Plants injurious to health will be moved outside the city bounds.

The increase in housing is allotted a special place in the five-year plan for the capital. The programme envisages the building of 27,000,000 sq m of living space in the said period.

Alongside housing, much is to be done in the next few years for the further development of educational institutions, health services, culture, trade, public catering and communal and other services.

Our city already has an adequate number of schools for the instruction of 88 per cent of the children in the morning shift. The problem of accommodating all children in preschool, child-care institutions — kindergartens and creches — has also been practically solved. It is planned to build schools for 115,000 pupils, and kindergartens and creches for 57,600 children in the five-year period.

A few words about shopping. In the five-year period we plan to open 1,000 shops and 800 public catering establishments — canteens, cafes and restaurants. The reconstruction of TSUM (Central Department Store) is to be completed and work is to start on a big department store in Komsomolskaya Square — near the three railroad terminals.

The capital will have new sports facilities — the construction of a rowing channel is already under way; there will be a unique roofed stadium, seating 35—40,000 spectators, as well as other sports centres. Cultural institutions have not been forgotten either. The new building of the Moscow Art Theatre will shortly open its doors and reconstruction will be completed on the building of the Sovremennik Theatre. Work will also be completed, before the five-year period ends, on the State Picture Gallery and on a new building and a book depository for the Lenin Library.

Transport poses an acute problem for all large cities in the world. The capitals of the major capitalist states seem unable to cope with the problem. Moskow also has a transport problem, although it is not quite so grave. The territory of the capital has expanded considerably in the last few years and with it came large-scale migration of the population. Every year some 500,000 Muscovites move from one area to another, when they get new flats, and for other reasons. All that calls for the further development and improvement of the city's transport services.

The plan envisages the further priority development of the Metro, which is the most convenient and effective means of conveyance. Its total length is to grow from 140 to 167 kilometres in these five years. The overall length of trolleybus and bus routes is to more than double in the same period. A considerable number of comfortable trolleybuses and buses are to be added to the capital's passenger service.

Roads constitute the second facet of the transport problem. A decision has been taken to reconstruct many of the existing thoroughfares and to build new roads.

Construction has already started on a new circular road, which will link several of the city's districts, lying midway betwen the Moscow Circular Highway and the Sadovoye Ring Road.

The General Plan envisages polycentric planning for the modern capital instead of the traditional monocentric system. We plan to set up in Moscow 8 complex zones united by a system of the general city centre. Up to 1,000,000 people will be living in each of them. And the zones are to incorporate districts with a population of 250—400,000 each. And, lastly, these districts are to contain housing estates for 30—70,000 people, equipped with the necessary complex of cultural and communal institutions, sports facilities and greenery.

In the centres of these zones the plans provide for the erection of large architectural ensembles, the construction of new squares and open green spaces which form an inseparable feature of the reconstructed city.

The experience assessed by other cities always did offer and still offers invaluable help. Take, for example, the achievements of the builders of the city of Vilnius in the Lithuanian SSR. The city's new districts have been built with great architectural skill. We can also learn from the Leningrad designers, who are successfully working on advanced spatial, large-span constructions which make it possible to create buildings in vivid modern architectural style. The experience of the builders of Yerevan, Minsk, Krasnodar and other cities is also quite interesting.

One of the main tasks in the development of Moscow in the next few years is the reconstruction of the city's centre adjoining the Kremlin. The area within the Sadovoye Ring Road will retain its significance as the city's historic-revolutionary, cultural, educational and administrative public nucleus. All the valuable architectural relics and many of the old streets with their unique structure will remain untouched.

Our aim is to turn Moscow into a city which will be conducive to highly-productive work and provide the people with every comfort and facilities for rest and leisure.

Vladimir PROMYSLOV,
Chairman of the Executive Committee of the Moscow City Soviet

The tradition of holding national Days of the Union Republics at the USSR Exhibition of Economic Achievements in Moscow has developed in this jubilee year of the USSR. Soviet Byelorussia has been the most recent one to demonstrate her achievements in economic and cultural spheres. A representative Byelorussian delegation visited the capital. ON PHOTO: members of Byelorussian delegation in the house-museum of V. I. Lenin.

KALEIDOSCOPE

** New exhibition grounds will be opened in Krasnaya Presnya, Moscow, to replace pavilions in Sokolniki Park that are too cramped. The grounds will cover about 83 hectares and incorporate the Krasnaya Presnya Park of Culture and Rest. In August 1975 an International Exhibition of «Building and Road-Making Machinery and Equipment for Mechanization of Construction and Erection» will be held there.*

** A congress of RSFSR artists has ended in Moscow. Their Union has a membership of more than 7,500 specialists in all branches of the art. The congress was attended by delegaties from professional groups from Areas, Regions and Autonomous Republics within the Federation. They discussed topical problems and reviewed the results of their work over the last four years. The report was delivered by Gelyi Korzhev, Chairman of the Union's Board, who pointed out that the period in question had been extremely fruitful. Thirty-four exhibitions had been held and most of the entries had depicted Soviet working people.*

** A meeting has been held at the Kremlin Palace of Congress to mark the centenary of the Moscow Pedagogical Institute named after Lenin. The veteran institute was awarded an Order of Lenin for its outstanding work in training highly competent teachers, and for its research work. In Soviet times over 50,000 teachers for secondary schools and pedagogical institutes have graduated from this educational establishment. Its fourteen faculties train teachers in 25 different branches and enrol more than 10,00 students and over a thousand postgraduates.*

** An exhibition of modern Soviet architecture has been shipped to Brazil from Moscow. The exhibits show some of the more than 900 new cities and towns that have grown up since the establishment of Soviet power. Many of them, for instance, Navoi, Shevchenko and Togliatti, are recognized models of modern town planning. People in Brazit will be able to see what is being built in the capitals of all the Union Republics, where new housing estates are remarkably attractive, combining national traditions with industrial methods of modern architecture.*

** The shop of the RSFSR Artists (54 Dimitrov St) sells articles of applied arts and souvenirs made by professional craftsmen. There is a wide choice of Khokhloma and other handicrafts, and textiles—mats, linen napkins, amber, semiprecious-stone, metal and mother-of-pearl ornaments, birchbark saltcellars, wodcuts, etc.*

There will be two exhibitions of paintings — one from Kostroma, and the other from the Moscow Region — to be held in the middle of next month.

RUSSIA

Russian Federation, Khanty-Mansi National District

Yuvan SHESTALOV

When an unheard-of frost took toll
Of Mother's life, when like a vice
Its clutches closed upon my soul,
As if to turn me into ice,
Then Russia laid upon my shoulder
Her guiding, soft maternal hand.
She made me wiser, stronger, bolder,
She gave me bread and home, my land.
She watched me as she built and formed me
With eyes as radiant as Spring.
Her motherly affection warmed me;
I felt the wish to live and sing.
And when the gates of youth I entered
She met me in a girl's sweet guise
And I, beyond my will, surrendered
To her enchanted, ardent eyes.
With springtime sunbeams she lit up
The heart in me, and made time tly,
And hand in hand, we drank life's cup
And full of happiness was I.
In joy and grief, in rain and sunshine
She was a friend and loving wife.
Then as a gift to me from Russia
A daughter came into my life.
Soon we will speak to one another
The language of my native parts.
Let her be gentle like her mother,
Like Russia, generous of heart.
Two kindred bloods within her flow,
That of a Russian and Mansi.
Let people call her both and know
How doubly dear she is to me.

Translated by Dorian Rottenberg

Moscow. Kutuzovsky Avenue. *Photo TASS.*

[Працяг. Пачатак у №№ 47—50]

...Адзін эпізод з тых дзён. Не самы небяспечны, не самы рызыкоўны. І расказаны ён адной з памочніц Клумава гэтак проста, быццам справа ішла пра самыя звычайныя рэчы, быццам ні яна, ні прафесар не рызыкавалі жыццём, не хадзілі па вастрыі нажа.

Знешне жыццё прафесара Клумава і цэлай групы яго памочнікаў: урачоў, медсясцёр — усіх, каму давяраў ён і хто давяраў яму, нічым асабліва не магло насцярожыць. Праўда, горды і незалежны выгляд прафесара раздражняў акупантаў і іх прыхвасняў. Ярашэвіч, як пантэра, сачыла за кожным яго словам, позіркам, рухам, гатовая кожную мінуту накінуць пятлю на шыю.

Але вакол, побач былі свае, аберагалі, як маглі, адзін аднаго, і ў першую чаргу прафесара, памагалі, папярэджвалі.

Толькі не заўсёды гэта ўдавалася. Першай ахвярай стаў сябар Клумава, загадчык кафедры фізікі Мінскага медыцынскага інстытута Уладзімір Анісімаў.

...Па вечарах, калі ў пакоі Зубарава збіраліся госці і адтуль несліся гукі патэфона, калі прэферансісты канчалі распісваць «пульку», — у тым жа будынку, у лабараторыі, дзе размяшчаліся медыцынскія апараты, два немаладыя прафесары схіляліся над прыёмнікам. Прыглушаны трэск атмасферных перашкод — і голас далёкай роднай Масквы: «Ад Савецкага Інфармбюро! У апошні час!» Адзін прафесар не адрываўся ад ручак прыёмніка, каб выпадкова не прарваўся мацней гук, другі— пісаў, пісаў. (Памятаеце маленькія скрутачкі папяроснай паперы са зводкамі?).

Клумаў і Анісімаў. У цэнтры горада, пад бокам у СД і гестапа, сабралі яны радыёпрыёмнік і слухалі Маскву.

Ён быў вельмі добры чалавек, прафесар-фізік Уладзімір Анісімаў. Добры, мяккі, майстар на ўсе рукі, але з «жыцейскага» пункту гледжання нейкі непрыстасаваны і нават бездапаможны. Клумаў сустрэў яго на вуліцы ў першыя месяцы вайны — Анісімаў галадаў, але не хацеў аддаваць свае веды фізіка ворагу. Яўген Уладзіміравіч прапанаваў Анісімаву перайсці жыць у бальніцу, заняцца рамонтам медыцынскіх прыбораў, дабіўся спецыяльнага дазволу аддзела аховы здароўя «на аднаразовае харчаванне Анісімаву за кошт бальніцы» (афіцыйны загад пасля вайны знайшлі ў архівах — дазвол на міску баланды прафесару!). Клумаў па-братэрску дзяліўся з ім кавалкам хлеба, і, пэўна, сакрэтаў у падпольнай дзейнасці паміж сябрамі не было. Бо першы нумар падпольнай «Звязды», які спецыяльна для Клумава прынеслі ў бальніцу, хутка апынуўся ў руках Анісімава. Ён прынёс газету сваім бацькам, што жылі на Першамайскай вуліцы, чытаў ім, радаваўся кожнаму слову...

Так і невядома дасюль, ці хто выдаў Анісімава, ці гэта была выпадковасць. Але гестапа заспела яго ў лабараторыі ў тую хвіліну, калі толькі-толькі прагучаў голас Левітана: «У апошні час...» На шчасце, Клумаў быў на тэрміновай аперацыі.

Пасля вайны да жонкі Анісімава прыходзіў чалавек, які сядзеў у адной з ім камеры. Ён сказаў:

— Ваш муж вытрымаў усё. Катаванні, здзекі, цяжкую інфекцыйную хваробу. Яго давялі да стану поўнай душэўнай дэпрэсіі. Але ён нікога не выдаў, нічога не расказаў.

І не прасіў літасці. Хаця можна сабе ўявіць: варта было яму, прафесару, стаць на калені, згадзіцца служыць Германіі, як вароты турмы расчыніліся б перад ім у тую ж хвіліну. Ён не быў героем. Ён няшмат паспеў зрабіць. Але і яго імя варта ведаць людзям. Гэта імя патрыёта і адной са шматлікіх ахвяр вайны.

Арыштавалі Анісімава. Хмары ўсё гусцей і гусцей збіраліся над галавою самога Клумава...

...Ішла аперацыя. Пэўна, складаная, калі запрасілі Клумава, — значыць, выпадак быў асабліва цяжкі. Прафесар схіліўся над хворай, зрабіў некалькі першых надрэзаў — і раптам у аперацыйную, насуперак усім правілам, увайшла Галіна Мікалаеўна.

— Жэня, у нас вобыск!

Ні на хвіліну не ўзняў галавы, сказаў толькі ціха і цвёрда:

— Прашу выйсці адсюль.

— У нас гестапа, Жэнечка!

— Яшчэ раз прашу! Хто дазволіў увайсці староннім?

Аперацыйная сястра ўзяла жонку прафесара пад руку, далікатна, але настойліва павяла яе да дзвярэй, і калі ўсхваляваная жанчына стаяла ўжо на парозе, Яўген Уладзіміравіч сказаў зусім іншым тонам:

— Не хвалюйся. Усё будзе добра. Я гэтага чакаў...

І сапраўды, ён гэтага чакаў. Можа «чакаў» — не зусім тое слова, але надта вялікай неспадзяванкі ў «візіце» гестапа для прафесара не было. Учора яму паклалі на стол кнігу. Прафесар пагартаў яе і ўбачыў запіску: «Яўген Уладзіміравіч, прашу падрыхтаваць для партызан...» — і далей ішоў цэлы спіс медыкаментаў. Ні на хвіліну не сумняваўся, што гэта правакацыя. Хто паклаў запіску? Зубараў? Белікава? Ярашэвіч? Кожны з іх мог зрабіць гэта, і разлік тут быў просты, прымітыўны нават, але па-свойму — хітра задуманы. Не знайшоў бы прафесар запіску, не знішчыў бы яе — і вось, калі ласка, фармальная прычына для арышту. Для гестапа была б толькі зачэпка, а там — допыты, катаванні, і язык, маўляў, рана ці позна развяжацца. І тое сказаць: калі б крыху раней, месяц-два назад, пакуль яшчэ не ўсе падпольшчыкі, не ўсе сувязныя засвоілі азы канспірацыі і гэтакія запіскі з імёнамі і прозвішчамі прыходзілі нават з лесу, ён, прафесар, мог бы паверыць і сапраўды пакласці «ва ўмоўленае месца» ўсё, што ў яго прасілі. Было б яшчэ горш...

Скончыў аперацыю, падняўся ў свой пакой. Адчыніў дзверы, стаў на парозе, хвіліну-другую глядзеў на «мамаева пабоішча», потым падышоў да жонкі, пагладзіў яе па галаве, абняў і лёганька пасадзіў на крэсла. Сам сеў побач. Так яны і сядзелі моўчкі, стары прафесар і яго жонка, яго верная, добрая Галіна Мікалаеўна, сядзелі доўга, пакуль гестапаўскі афіцэр пераглядаў кнігу за кнігай, дакумент за дакументам.

...Адступіся, час! І перанясі нас у тую хвіліну, калі стары, стомлены пасля цяжкай аперацыі савецкі прафесар і яго жонка сядзяць у крэслах і чакаюць... Іх там было нямала, дакументаў — пасведчанняў, характарыстык, фатаграфій, пісем. За доўгае жыццё назбіралася. І, пэўна, браў штосьці ў рукі гестапавец, а перад вачыма прафесара праходзілі даты, падзеі, праходзіла ўсё яго жыццё.

Яго жыццё... Гэта яго навука, яго «хворыя», пацыенты, жанчыны, якіх ён вылечыў, выратаваў, яго артыкулы ў спецыяльных часопісах, яго кнігі па гінекалогіі і хірургіі. ...І дом маскоўскага адваката, дзе ён нарадзіўся, дзе ўпершыню высокія паняцці гуманізму, справядлівасці для яго, юнага гімназіста, потым студэнта медыцынскага факультэта, увасабляліся ў словы і справы яго бацькі, абаронцы людзей, пакалечаных сацыяльным ладам... І маленькая земская бальніца на Лоеўшчыне, куды прыехаў малады доктар, і хаты беларускіх сялян, дзе прайшоў ён нешматслоўную і простую навуку любові да чалавека. Можа там навучыўся ён дзяліцца з галоднымі апошнім кавалкам хлеба? Можа адтуль прыйшла тая яго рыса, якую цяпер без слёз на вачах не могуць успамінаць жанчыны, што працавалі з ім разам у галодныя і небяспечныя ваенныя гады, — усё зразумець, усё ўбачыць, не чакаць просьбы і скаргі.

«Прыслаў аднойчы мне кзвалак сала... «Навошта, прафесар?» — пытаюся. «Нічога, душачка, нічога. Вы за апошні час вельмі схуднелі, адкарміцеся трохі».

«У мяне былі маленькія дзеці, — расказвае другая, якая працавала санітаркай, — і кожны раз Клумаў не пройдзе міма, каб не перадаць што-небудзь ім: то кавалак хлеба, то талерку супу. Фіранкі ў сваім пакоі зняў, сыну майму аддаў на штонікі...»

«Заплаціў сваімі грашыма за маю аперацыю...»

«Сабраў усіх нас, з роднымі, у бальніцы, некалькі палат спецыяльна вызваліў, калі ў горадзе ішлі масавыя арышты і расстрэлы пасля забойства Кубэ».

Кожнага чалавека ўбачыць, кожнага пачуць...

Яго жыццё.

Вось глядзіць гестапавец на фотакартку медыцынскай сястры ў касынцы з чырвоным крыжам—на яго Галю, яго жонку. Урач Клумаў і медыцынская сястра сустрэліся на фронце грамадзянскай вайны. Абое, прадстаўнікі рускай інтэлігенцыі, без роздуму і вагання аддалі сябе рэвалюцыі, бо сэрцам зразумелі справядлівасць і высокую гуманнасць яе ідэй.

Першыя гады Савецкай улады, гады яго ўрачэбнай практыкі, дарога ў навуку, кафедра інстытута, прызнанне, аўтарытэт. Вось характарыстыкі, пасведчанні, граматы. Як абыякава адкідвае іх убок нямецкі афіцэр! Яму гэта ўсё нецікава... А вось і пісьмы, цэлы стос пісем ад тых, каго вылечыў, каго выратаваў...

І вайна... І першая сустрэча з «Белкай». І тое пытанне, што, здаецца, дасюль яшчэ гучыць у яго ў вушах: «З кім вы?..»

...З кім?! Праз Кашычкіну—з адной групай падпольшчыкаў. Праз Вікторыю Рубец — з другой. Праз Ганну Мохаву —з трэцяй. Чым шырэйшы круг, тым танчэйшы лёд.

А яны сядзяць вось цяпер удваіх на мяккіх крэслах — гэта адзінае, што засталося ад абстаноўкі былой прафесарскай кватэры, — сядзяць, знешне спакойныя, пажылыя інтэлігентныя людзі. Ён — усё гэтак жа, як быў на аперацыі, у белым халаце, у шапачцы, яна— у хатніх тапачках, на плячах цёплы плед. Сядзяць і чакаюць, пакуль скончыцца вобыск. Афіцэр, нарэшце, перагледзеў усе кнігі і дакументы—больш яго нічога не цікавіла, ён, зусім пэўна, шукаў запіску — папрасіў прабачэння і пайшоў. Можа на гэты раз навальніца прайшла міма?

...Праз некаторы час Клумава арыштавалі. І хутка выпусцілі. «За адсутнасцю ўлік...» Арыштавалі другі раз. І зноў выпусцілі.

З некалькіх атрадаў і падпольных груп у тыя дні яму прапаноўвалі:

— Яўген Уладзіміравіч, вам трэба ў атрад. Вам тут небяспечна. Трэба пакінуць горад...

— Не магу. Я тут — на сваім пасту. Я тут патрэбен.

І ўжо ў апошні раз, калі за бальніцай цікавалі днём і ноччу, — у апошні раз, пасля другога арышту, — сказаў:

— А цяпер позна. Калі я пайду, загінуць многія.

Таварыш Самарын. Пра яго мы яшчэ будзем успамінаць, і не адзін раз, на гэтых старонках. І пра апошні яго шлях вам раскажам.

ФРОСЯ-ФРОСЕЧКА

— Бывала, падыдзе, абдыме за плечы і скажа: «Мне трэба пайсці дні на тры. Прыдумайце што-небудзь галоўнаму». Куды ішла Фрося, што яна рабіла, ніхто не ведаў.

— Пра гэта ведаў я. Фрося Калбеева была сувязная нашага партызанскага атрада.

Такі кароткі дыялог адбыўся гадоў праз дваццаць пяць паміж жывымі — Наталляй Сінькевіч і Віталем Арэхавым. А за гэтымі словамі, за гэтым дыялогам — чалавек, якога няма. Яго жыццё, яго боль і пакуты. І невядомы людзям яшчэ адзін подзвіг.

Але вернемся да Арэхава. Мы пакінулі яго, раненага камандзіра, у тую хвіліну, калі ён апрануў белы халат і з насілкамі ў руках прайшоў міма нямецкага афіцэра.

Што адбылося потым?

Зажылі ўжо раны, а ён усё яшчэ тут, у бальніцы. Пакрысе дапамагае сёстрам і санітаркам, носіць ваду, сячэ дровы. Знайшлі для яго і кватэру ў сям'і Ліштван, забяспечылі дакументамі. А што далей?

Бальніца выратавала ад смерці. Выхапіла, фактычна, з палону. Бальніца павяла і далей...

Медыцынская сястра Ала Сідаровіч неяк асабліва пільна прыглядалася да Арэхава, асцярожна заводзіла з ім размовы пра немцаў, пра партызан, давала лістоўкі, зводкі Савецкага Інфармбюро. І аднойчы, улучыўшы хвіліну, калі нікога не было побач, сказала:

—Ты, Віця, што думаеш далей рабіць?

— Хацеў бы да партызан. Толькі дарогі не ведаю, — шчыра прызнаўся ён.

— Чакай сёння вечарам гасцей...

[Працяг будзе].

ПРА АДЗІН ДОМ

Жыву я ў Маскве з 1915 года. Праўда, даводзілася выязджаць на некаторы час: то ў Чырвоную Армію (у часе грамадзянскай вайны), то на настаўніцкую працу. Але ўсё ж магу лічыць сябе старым масквічом.

За такі доўгі час, як паўстагоддзя, пабачыў я ў Маскве шмат цікавага — і архітэктурных помнікаў, і людзей выдатных. Пра свае сустрэчы з людзьмі я раскажу калі-небудзь адмыслова. А цяпер мне хочацца расказаць пра адзін маскоўскі дом, у якім мне па волі лёсу давялося бываць тройчы.

Гэты дом (вуліца Вароўскага, 52) належаў калісьці графам Салагубам. Для многіх ён вядомы, як «дом Растовых». Запэўніваюць, што нібыта Леў Талстой у сваім славутым рамане «Вайна і мір» апісваў менавіта гэты дом. Так яно ці не, але добра вядома, што ў часе працы над раманам Леў Мікалаевіч бываў тут не аднойчы, бо гэты дом адзін з нешматлікіх, які не згарэў у 1812 годзе. Я, зразумела, не буду разбіраць тут гісторыю дома з дарэвалюцыйнага часу. Нагадаю толькі цікавыя моманты з паслярэвалюцыйнага перыяду.

Калі з Ленінграда ў Маскву пераехаў быў Савецкі ўрад, у гэтым доме размясціўся Беларускі нацыянальны камісарыят (Белкамнац). Тут жа была і рэдакцыя першай беларускай савецкай газеты «Дзянніца». У гэтым доме рыхтаваліся першыя беларускія савецкія кнігі. Тут працавалі выдатныя дзеячы, якія ў 1919 годзе абвясцілі ў Мінску ўтварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай рэспублікі (А. Чарвякоў, С. Бурбіс, З. Жылуновіч і шмат іншых).

У 1918 годзе, скончыўшы настаўніцкую семінарыю, я прыйшоў у гэты камісарыят з просьбай, каб мяне паслалі настаўнікам на Беларусь. Мне адказалі, што «ў даны момант гэта немагчыма. Беларусь занята ворагам. Заходзьце, крыху пачакаўшы». Увосень гэтага ж года я паехаў настаўнічаць на Тульшчыну, а адтуль пайшоў у Чырвоную Армію.

Дэмабілізаваў ш ы с я ў жніўні 1921 года, я дачуўся, што ў Маскве адкрываецца Літаратурна-мастацкі інстытут імя В. Брусава і што Валерый Якаўлевіч будзе рэктарам і прафесарам гэтага інстытута. Я паслаў дакументы, а ў прызначаны дзень прыйшоў на ўступныя экзамены. Глянуў—ды гэты ж дом мой стары знаёмы! Тая ж музейная мэбля, тыя ж скульптуры, нават «мядзведзь» перад гардэробным пакоем, але і ўсё інакшае: поўна юнакоў і дзяўчат, якія прыйшлі сюды вывучаць таямніцы літаратурнай творчасці. Мяне прынялі, і займаўся я тут амаль чатыры гады.

Прайшоў яшчэ вялікі адрэзак часу. Я выязджаў з Масквы на Далёкі Усход, у Сібір. Аб'ехаў, як кажуць, «круг свету». За гэты час Брусаўскі інстытут ліквідаваўся. Замест яго і ў іншым будынку заснаваўся Літаратурны інстытут імя М. Горкага.

Калі я ў 1958 годзе прыехаў у Маскву, мне трэба было зайсці ў Саюз пісьменнікаў СССР. Узяў адрас: вуліца Вароўскага, 52. Прыходжу—той самы будынак! І зноў перамены. Наша самая большая аўдыторыя, у якой чытаў лекцыі Валерый Брусаў, дзе гучалі першыя творы маіх сяброў-студэнтаў, а пасля вядомых пісьменнікаў Арцёма Вясёлага, Сцяпана Злобіна, Івана Кашкіна, Барыса Песіса, дзе перад намі выступалі Анатоль Луначарскі, Уладзімір Маякоўскі, Сяргей Ясенін, гэтая аўдыторыя стала канферэнц-залай Саюза пісьменнікаў.

Тройчы лёс прыводзіў мяне ў гэты будынак... Калі я бываю ў ім цяпер, перад маімі вачыма паўстаюць сябры студэнцкіх часоў і нашы патрабавальныя настаўнікі. Наяве бачу многіх выдатных і шырока вядомых сучасных пісьменнікаў, якія рабілі тут свае першыя крокі.

Вось якім цікавым для мяне выдаўся гэты маскоўскі дом і як для беларуса і як для пісьменніка.

Уладзімір ДУБОЎКА,
пісьменнік.

УЗОР СЛУЖЭННЯ ЛЮДЗЯМ

На сцэне—вялікі партрэт Якуба Коласа, упрыгожаны кветкамі, ярка-пунсовымі, пяшчотна-белымі. Святло вялізных крышталёвых люстраў сотнямі агеньчыкаў адбіваецца ў вачах людзей, якія сабраліся ў Калоннай зале Дома Саюзаў на ўрачысты вечар, прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння вялікага песняра Беларусі. Я. Колас належыць не толькі нам, беларусам. Свежасць яго таленту, глыбіня яго твораў адкрылі яму сэрцы мільёнаў чытачоў. Перапоўненая зала была данінай пашаны, якую прынеслі нашаму песняру масквічы і госці сталіцы СССР.

У прэзідыуме—намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Сняжкова, загадчык сектара мастацкай літаратуры ЦК КПСС А. Бяляеў, загадчык аддзела культуры ЦК Кампартыі Беларусі С. Марцалеў, дзеячы культуры і мастацтва, пісьменнікі—прадстаўнікі шматнацыянальнай літаратуры Краіны Саветаў, дэлегацыя Саюза пісьменнікаў БССР на чале з Максімам Танкам.

Вечар адкрыў Герой Сацыялістычнай Працы, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Мікалай Ціханаў. 90-годдзе з дня нараджэння Якуба Коласа, сказаў ён,—вялікае свята ўсёй савецкай літаратуры.

Якуб Колас—пясняр сацыялістычнага братэрства, адзін з заснавальнікаў беларускай савецкай літаратуры. Увесь свой талент паэта-трыбуна, веды вучонага, мудрасць і нястомную энергію дзяржаўнага дзеяча Колас аддаваў Радзіме, справе ленінскай партыі.

— Мы рыхтуемся да слаўнай даты,—сказаў у заключэнне М. Ціханаў,—50-годдзя ўтварэння Саюза ССР. І калі настане дзень залатога юбілею, сярод шматмоўных вершаў на свяце свабодных народаў прагучаць і вершы Якуба Коласа.

Пра жыццёвы і творчы шлях Я. Коласа расказаў прысутным народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін. Ён нагадвае тую высокую ацэнку, якую даў М. Горкі рэвалюцыйнай творчасці Я. Купалы і Я. Коласа. Уся 50-гадовая літаратурная дзейнасць Канстанціна Міхайлавіча, гаворыць прамоўца, пачынаючы з першай кнігі паэта «Песні жальбы», была ўзорам натхнёнага служэння людзям працы.

І. Шамякін характарызуе глыбока рэалістычныя, народныя па духу творы Якуба Коласа — жамчужыну беларускай літаратуры паэму «Новая зямля», паэму «Сымон-музыка», аповесці «На прасторах жыцця», «Дрыгва» і іншыя. «Дрыгва» разам з «Разгромам» А. Фадзеева і «Браняпоездам 14-69» У. Іванава аказала вялікі ўплыў на фарміраванне поглядаў маладога пакалення 30-х гадоў, пакалення, якое стала на абарону Радзімы ў 1941 годзе.

Адна з характэрных рысаў Я. Коласа—яго інтэрнацыяналізм, адна з самых значных тэм яго творчасці—дружба народаў. Праз усё жыццё пранёс ён светлую любоў да вялікага рускага народа і яго літаратуры, да народаў-братоў нашай сацыялістычнай Радзімы.

Глыбокі сэнс у тым, сказаў І. Шамякін, што 90-годдзе Я. Коласа адзначаецца ў Маскве напярэдадні залатога юбілею Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Адсюль, з Масквы, з перакладаў на рускую мову пачалася вялікая слава беларускага песняра.

Адзін за адным падымаюцца на трыбуну пасланцы братніх літаратур Савецкай краіны. Украінскі паэт Мікола Нагнібеда з удзячнасцю гаворыць пра Коласа — перакладчыка «Кабзара» на беларускую мову, расказвае аб сваіх сустрэчах з песняром. Прадстаўнік літоўскай пісьменніцкай арганізацыі Альбінас Жукаўскас прысвяціў сваё выступленне братэрскаму сяброўству, якое яднала Я. Коласа з літоўскімі пісьменнікамі. Грузінскі паэт Іосіф Наняшвілі прачытаў коласаўскі верш «Жыве Руставелі» на мове Руставелі ў сваім перакладзе.

«Дзень добры, свята народаў! Дзень добры, дзядзька Якуб!» Гэта словы з верша ленінградца Леаніда Хаустава, прысвечанага Коласу. Узбекскі пісьменнік Рахмат Файзі расказаў пра ташкенцкі перыяд творчасці беларускага песняра, пра тое, як шануюць памяць аб ім узбекскія сябры. «Вершы Якуба Коласа гучаць так, нібы яны напісаны сёння», — сказаў рускі пісьменнік Анатоль Сафронаў і ў пацвярджэнне гэтай думкі прачытаў напісаны яшчэ да вайны верш «Народам СССР».

А. МАЛАШЭЎСКАЯ.

НА МОВЕ ВЯЛІКАГА РУСКАГА НАРОДА

У пачатку стагоддзя Максім Багдановіч, робячы агляд здабыткаў беларускай літаратуры, марыў аб тым часе, калі зерне, кінутае ў глебу яе першымі сейбітамі, прарасце буйным коласам, і наша літаратура не толькі беларускаму народу, але і іншым народам, сусветнай культуры прынясе свае дары.

Мара паэта здзейснілася. Расквітнела, дала багаты плён літаратурная ніва Беларусі і цяпер шчодра дзеліцца сваімі дарамі з іншымі народамі і краінамі. Я. Купалу, Я. Коласа, К. Крапіву, П. Броўку, М. Танка, А. Куляшова, І. Мележа, В. Быкава, І. Шамякіна чытаюць рускія і украінцы, таджыкі і грузіны, якуты і латышы. Творы беларускіх паэтаў і празаікаў перакладзены на многія замежныя мовы.

Шлях да гэтай вядомасці, да прызнання нашай літаратуры ва ўсім свеце ляжаў праз добрыя мастацкія пераклады і ў першую чаргу праз пераклады на мову вялікага рускага народа.

Ля вытокаў цяпер шырокага і паўнаводнага рэчышча, па якім ідуць да рускага чытача творы беларускіх аўтараў, стаяў Максім Горкі. Яго пераклад купалаўскага верша «А хто там ідзе!» не толькі стаў хрэстаматыйным, але і абумовіў цікавасць да нашай літаратуры з боку выдатных рускіх майстроў слова. Беларускую паэзію перакладалі В. Брусаў, М. Ісакоўскі, А. Твардоўскі, А. Пракоф'еў, С. Маршак, М. Святлоў, А. Ахматава, Я. Смелякоў, У. Раждзественскі, М. Рыленкаў, К. Сіманаў, І. Сельвінскі. Гэтыя імёны самі па сабе могуць служыць гарантыяй высокага эстэтычнага ўзроўню перакладзеных твораў.

За вялікія заслугі ў галіне мастацкага перакладу беларускай літаратуры на рускую мову Міхаілу Ісакоўскаму, Яўгену Мазалькову, Аляксандру Пракоф'еву і Якаву Хелемскаму прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры БССР. Шэраг перакладчыкаў узнагароджаны Ганаровымі граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі. Сярод іх вядомы паэт Д. Кавалёў, які жыве і працуе ў Маскве.

Да Дзмітрыя КАВАЛЁВА звярнуўся карэспандэнт газеты «Голас Радзімы» з просьбай адказаць на пытанні, звязаныя са справай мастацкага перакладу беларускай літаратуры.

— Дзмітрый Міхайлавіч, Вы нарадзіліся ў Беларусі, настаўнічалі на Гомельшчыне, пасля вайны працавалі ў Мінску. Тут выйшла Ваша першая кніжка. У нашай рэспубліцы Вас добра ведаюць як аўтара многіх паэтычных зборнікаў і як выдатнага перакладчыка беларускіх твораў. Каму з нашых пісьменнікаў аддаяце Вы перавагу? Як выбіраеце аўтара?

— Гэта вельмі важна, знайсці аўтару перакладчыка, а перакладчыку— аўтара. Знайсці тую адзіную ўзаемапранікнёнасць думак, пачуццяў, калі паэт-перакладчык бачыць у вершы паэта тое, што адгукаецца ў яго душы, як сваё. Прыклад такой садружнасці — Міхаіл Ісакоўскі і Аркадзь Куляшоў. Куляшоў, празрысты і непаўторны, у перакладах Ісакоўскага гучыць так, нібыта гэта адразу пісалася па-руску. Гэта ўзор, да якога ўзніміліся нямногія.

Я перакладаў П. Броўку, М. Аўрамчыка, П. Панчанку, М. Танка, К. Кірэенку, М. Калачынскага, А. Пысіна, М. Сурначова, А. Лойку. Не заўсёды быў задаволены сваёй працай, штосьці, на мой погляд, атрымалася няблага.

«Сваімі» аўтарамі я хутчэй лічу празаікаў. Хаця калі ўзяўся перакладаць «Жменю сонечных промняў» Янкі Брыля, то адчуў у гэтай кніжцы паэзію нават большую, чым у некаторых вершах.

Перакладу на іншыя мовы вартыя толькі тыя творы, якія ўзбагачаюць чытача нечым новым, значным. Такім творам я лічу «Палескую хроніку» Івана Мележа. Першы варыянт перакладу рамана «Подых навальніцы» я зрабіў прыблізна за тры месяцы. А ўсяго спатрэбіўся год, каб атрымаўся канчатковы варыянт.

Галоўным для мяне было дабіцца таго ж уражання на рускага чытача, якое зрабіў на мяне раман у арыгінале. А гэта ўяўлялася магчымым толькі пры захаванні мовы герояў — пявучай, вобразнай, насычанай пачуццямі.

Літаратурная кніжная мова абядняла шматколернасць народнай гаворкі. Прабаваў перакладаць гутарковую мову Мележа на такую ж гутарковую рускую — атрымлівалася нешта несапраўднае, стылізаванае.

Як перадаць гаворку палешукоў з лёгкім націскам на «о» ў тым гучанні і рытме, якія ўласцівыя ёй? На Гомельшчыне, у тых мясцінах, дзе я нарадзіўся, больш націскалі на «а», а ў астатнім было шмат падабенства. Гэта вельмі дапамагло. І я вырашыў перадаць характар беларускай сродкамі рускай мовы, пакідаючы ў ёй беларусізмы. Так, як рабіў, напрыклад, Гогаль, які часам «абукраінліваў» рускую мову. Мяркуючы па водгуках, гэты шлях аказаўся правільным.

Прызнаюся, што адчуваю сапраўдную радасць, калі працую над перакладамі беларускай прозы. Гэта не толькі цудоўныя творы Брыля з яго сталай і адначасова юнай мудрасцю, не толькі паэтычнасць і лірызм шырокай мележаўскай эпапеі, гэта і выдатныя апавяданні маладых беларускіх пісьменнікаў, такіх, як Анатоль Кудравец, перакладаючы якія, я адчуваю сапраўднае творчае натхненне.

— Пераклады на рускую мову былі і ў значнай ступені застаюцца асновай для далейшага распаўсюджвання беларускай літаратуры ў рэспубліках Савецкага Саюза, для перакладаў на замежныя мовы. Раскажыце, калі ласка, аб рускіх перакладчыках, што працуюць з беларускімі аўтарамі.

— Беларуская літаратура мае ў Расіі шмат сяброў, якія на працягу многіх год аддавалі і аддаюць ёй свае творчыя сімпатыі. Я ўжо гаварыў пра Міхаіла Ісакоўскага. Вялікім прыхільнікам і прапагандыстам твораў беларускіх пісьменнікаў быў Аляксандр Твардоўскі. У гэтым не раз пераконваліся чытачы часопіса «Новый мир», галоўным рэдактарам якога ён быў. Нельга не назваць Яўгена Мазалькова і Сяргея Гарадзецкага. Вельмі многа ў галіне перакладу зрабіў і робіць Якаў Хелемскі, якога звязвае з шэрагам беларускіх паэтаў сапраўднае творчае сяброўства, і ў першую чаргу з Петрусём Броўкам. Хелемскі першым пераклаў вершы Анатоля Вялюгіна, ён жа прадставіў маскоўскаму чытачу Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Караткевіча.

М. Гарбачоў, П. Кабзарэўскі, М. Браун, М. Камісарава, П. Сямынін, М. Сідарэнка, Д. Осін, В. Шэфнер, Б. Ірынін, М. Хаустаў, А. Астроўскі, К. Цітоў, П. Жалязноў, В. Звягінцава, С. Абрадовіч, А. Кудрэйка, Р. Казакова, І. Шклярэўскі — гэтым і іншым перакладчыкам беларуская літаратура абавязана сваёй папулярнасцю ў Расіі, ва ўсёй нашай краіне.

Вельмі многа зроблена рускімі майстрамі перакладу дзеля таго, каб беларуская літаратура стала здабыткам многіх народаў. Але мне хацелася б выказаць сваю асабістую думку наконт таго, што яшчэ трэба зрабіць. Яшчэ не знайшоўся перакладчык, які б здолеў у поўнай меры данесці да рускага чытача чароўную музыку вершаў Максіма Багдановіча. Няма на рускай мове такога перакладу «Новай зямлі», які мог бы параўнацца па сіле выразнасці з Коласавым арыгіналам. Не існуе, на жаль, на рускай мове таго сапраўды паталстоўскага маштабнага Кузьмы Чорнага, які ён ёсць на беларускай мове. Гэтыя «белыя плямы» чакаюць сваіх талентаў, бо толькі вялікаму і сапраўднаму таленту пад сілу выканаць такую работу.

— Дзмітрый Міхайлавіч, Вы з'яўляецеся членам савета па беларускай літаратуры пры Саюзе пісьменнікаў СССР. Раскажыце коратка пра дзейнасць гэтага савета.

— Пры Саюзе пісьменнікаў створаны саветы па нацыянальных літаратурах. Адным з іх з'яўляецца савет па беларускай літаратуры. Доўгі час, да апошніх сваіх дзён, яго ўзначальваў Яўген Мазалькоў, выдатны знаўца і сябра беларускай літаратуры. Цяпер старшыня савета Аляксандр Аўчарэнка.

На пасяджэннях савета абмяркоўваюцца новыя творы пісьменнікаў, разглядаецца работа беларускіх часопісаў. На такія абмеркаванні запрашаюцца супрацоўнікі рэдакцый, беларускія літаратары. Цікавым, напрыклад, было тэматычнае пасяджэнне «Беларускія паэмы». Савет вялікую ўвагу ўдзяляе перакладчыцкай дзейнасці, рэкамендуе для перакладу лепшыя творы. Савет наладжвае літаратурныя вечары, праводзіць сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі, якіх ведаюць і любяць у Расіі. А што гэта менавіта так, я з радасцю зазначаю на сустрэчах з чытачамі, калі яны, даведаўшыся, што я маю дачыненне да Беларусі, літаральна засыпаюць мяне пытаннямі; у кніжных магазінах, дзе бачу, як хутка раскупляюцца творы беларускіх аўтараў.

У Расіі добра ведаюць Мележа і Шамякіна, гэтага здзіўляючага майстра сюжэту. Чытаюць Лынькова, Крапіву, Быкава. Я не гавару пра Купалу і Коласа, яны даўно сталі блізкімі рускаму чытачу, як Тарас Шаўчэнка і Шата Руставелі. Вельмі папулярныя беларускія паэты— Броўка, Танк, Куляшоў, Барадулін і многія іншыя.

І радасна мне, што я маю дачыненне не толькі кроўна, не толькі сваім нараджэннем да беларускай зямлі, але і духоўна і, можа, галоўным чынам духоўна — у сваіх вершах, у сваіх перакладах.

Інтэрв'ю правяла Тамара РЭУТОВІЧ.

ПЯШЧОТНАСЦЬ — ГАМА ПАЧУЦЦЯЎ

Імя Рамуальдаса Ракаўскаса вядома далёка за межамі Літвы. 30-гадовы фотамайстар з Каўнаса — удзельнік і дыпламант многіх усесаюзных і міжнародных выставак. У яго свой «почырк», свая манера падачы «матэрыялу», галоўная рыса якой — заўсёды дакладна акрэсленая і лаканічна выказаная думка. Ракаўскас — мастак цікавы і своеасаблівы. І знаёмства з ім тым больш прыемнае, што ў яго творчасці нібы сканцэнтравана ўсё лепшае, што ўласціва сёння для школы літоўскай мастацкай фатаграфіі ў цэлым.

Мінчане з вялікай цікавасцю аднесліся да нядаўняй выстаўкі каўнаскага майстра, якую наладзіў сталічны фотаклуб. У экспазіцыю ўваходзіла каля 60 работ, аб'яднаных агульнай назвай-дэвізам «Пяшчотнасць». Здымкі, сюжэтна не звязаныя паміж сабою, аб'ядноўвае глыбокая чалавечнасць, эмацыянальнасць, паэтычнасць светаўспрыймання аўтара. Шчасце маладых і радасць мацярынства, прафесійная гордасць урача, пацыент якога ўпершыню пасля цяжкай хваробы змог выканаць патрэбнае практыкаванне, спрадвечная павага да хлеба, замілаванасць роднай прыродай, пільная ўвага да людзей працы... Фатаграфіі Ракаўскаса ўспрыймаюцца як мікранавелы, дзе сухі змест работы і падтэкст нагадваюць айзберг, дзевяць дзесятых якога схавана ў глыбіні.

Між іншым, шлях Рамуальдаса ў журналістыку (цяпер ён загадвае аддзелам ілюстрацыі ў маладзёжным літаратурным часопісе «Нямунас») пачынаўся з карэспандэнцый, замалёвак, лірычных мініяцюр. Захапленне фатаграфіяй прыйшло ва універсітэце. Як мастак ён заўсёды быў далёкі ад тэхнічных незвычайнасцей. Як журналіст — звяртаў асаблівую ўвагу на грамадскую актуальнасць сваіх работ.

Галоўнай і невычэрпнай тэмай для Ракаўскаса з'яўляецца ўнутраны свет людзей — іх пачуцці, думкі, спадзяванні, бо няма на зямлі нічога больш важнага, чым чалавек і яго шчасце.

Поўныя суму вочы старога. Аб чым спявае яму «вячэрняя скрыпка»? Можа нагадвае пра абяздоленую маладосць ці плача аб загінуўшых родных?

Як складзецца сямейнае жыццё ў маладых, што весела крочаць у шлюбных уборах пад праліўным дажджом?

Ці захаваецца ў дзіцячай памяці ціхі куточак старога двара, дзе так зручна наладжваць розныя гульні, весці «вайну» з індыкамі і назіраць за сямействам буслоў?

Розны ўзрост, розныя праблемы прайшлі праз сэрца мастака, адлюстраваліся на здымках, усхвалявалі гледачоў. У апошні дзень работы выстаўкі на яе абмеркаванне і сустрэчу з Рамуальдасам Ракаўскасам сабралася поўная зала мінчан—фотажурналістаў, аматараў, проста цікаўных. Шчырасць, добразычлівасць і абаяльнасць аўтара сталі апошнімі штрыхамі «Пяшчотнасці».

В. ТРЫГУБОВІЧ.

НА ЗДЫМКАХ: работы Р. РАКАЎСКАСА з выстаўкі «Пяшчотнасць». 1. «Аўтастрада». 2. «Маладыя». 3. «Рукі». 4. «Сельскі матыў».

◆ СПОРТ ◆ СПОРТ ◆

Тры залатыя медалі і сусветную вядомасць прынеслі XX Алімпійскія гульні гімнастцы з Гродна. Вольга Корбут пакарыла гледачоў і суддзяў сваім высокім майстэрствам, эмацыянальнасцю, смеласцю ў выкананні самых складаных элементаў. Журналісты 40 краін, якія ўдзельнічалі ў традыцыйнай анкеце часопіса «Уорлд спортс», аднадушна назвалі беларускую гімнастку «спартсменкай 1972 года».
НА ЗДЫМКУ: Вольга КОРБУТ.

Фота У. МЯЖЭВІЧА.

АД БЕЛАВЕЖЫ ДА САХАЛІНА

МОЗГ ПАД АХОВАЙ

Каб своечасова распазнаць стомленасць, вучоныя Беларускага універсітэта і Маскоўскага інстытута медыкабіялагічных праблем прапануюць сачыць за змяненнямі рытму сардэчнай дзейнасці. З'яўленне ў ім павольных хваль, як паказалі назіранні, папярэднічае зніжэнню разумовай дзейнасці. На аснове гэтага метаду створана эксперыментальная ўстаноўка для раннега распазнавання і прагназіравання стомленасці. Такія сістэмы могуць быць выкарыстаны для папярэджання памылак у рабоце людзей, якія кіруюць хуткадзейнымі механізмамі і апаратамі.

МАШЫНА СУПРАЦЬ ХМЫЗНЯКУ

110 гектараў зможа за сезон ачысціць ад хмызняку адзін трактарыст з дапамогай карчавальнага агрэгата К-15, створанага супрацоўнікамі Літоўскага навукова-даследчага інстытута гідратэхнікі і меліярацыі.

Машына карчуе не толькі хмызняк, але і пні, выдаляе з поля валуны і адначасова разрыхляе грунт для меліярацыі.

ПА МОДЗЕ СТАРАЖЫТНАЙ РУСІ

Л. Каўрова, 77-гадовая майстрыха з паўночнай вёскі, з поўным правам можа лічыць, што дзякуючы ёй і яе сяброўкам многія жанчыны Архангельска апранаюцца цяпер па модзе старажытнай Русі. У магазіны горада паступіла новая прадукцыя фірмы народных мастацкіх промыслаў «Беламорскія ўзоры» — упрыгожаныя карункамі сукенкі, хусткі са славянскай вяззю, рознакаляровыя сарафаны, шапачкі, сумачкі. Філіялы гэтага прадпрыемства аб'ядноўваюць 400 умельцаў, якія валодаюць сакрэтамі народнай вышыўкі, вязання, ткацтва, керамікі, разьбы па косці і дрэве.

Дасканала ведаючы традыцыі народнага прыкладнога мастацтва, нашчадкі пароў робяць сувеніры з футра, гліны, лыка, бяросты, распісваюць посуд, упрыгожанні.

«Беламорскія ўзоры» карыстаюцца папулярнасцю ў гарадах краіны, іх вырабы з поспехам экспанаваліся ў Японіі, ЗША, Канадзе. А камерсанты Францыі, Італіі, Бельгіі з'яўляюцца пакупнікамі рускіх сувеніраў.

ПРЭЙЛЬСКІ СЫР

Першую партыю прадукцыі выпусціла новае прадпрыемства Латвіі — Прэйльскі сыраробчы завод.

Абсталяваны па апошняму слову тэхнікі, гэты завод будзе вырабляць у год 2 200 тон сыру і 1 500 тон першакласнага сметанковага масла. Тут арганізуецца таксама вытворчасць малочнага цукру.

Новы завод — буйнейшае прадпрыемства гэтай галіны ў Савецкай Прыбалтыцы.

ВІДАЦЬ УСЯ АДЭСА

У Адэсе запалілася назва новай вышыннай гасцініцы «Чорнае мора».

На яе чатырнаццаці паверхах — усе зручнасці для гасцей горада. У кожны пумар падаецца кандыцыянаванае паветра, працуюць скарасныя ліфты з аўтаматычным кіраваннем. Тут адкрыты рэстаран, два бары.

Гасцініца пабудавана па праекту кіеўскіх архітэктараў. Прадугледжана ўзвядзенне ў цэнтры Адэсы цэлага комплексу вышынных гасцініц.

ЛЕЗГІНКА НА КАНАЦЕ

Ніводнае свята ў Дагестане не абыходзіцца без выступленняў канатаходцаў з высакагорнага аула Саўкра. Разам з дарослымі галавакружныя трукі на тонкім стальным дроце выконваюць і дзеці — выхаванцы адзінай у краіне спецыялізаванай дзіцячай спартыўнай школы канатаходцаў.

Часта ў школу прыязджаюць землякі, праслаўленыя канатаходцы, артысты Маскоўскага дзяржцырка Р. Абакараў і Я. Гаджыкурбанаў. Яны перадаюць дзецям свой вопыт, майстэрства і адбіраюць у свае трупы найбольш таленавітых.

ГУМАР

Кліент уваходзіць у атэль і пытаецца, ці ёсць свабодныя нумары.

— Ёсць два — адзін за 20, а другі за 30 франкаў, — адказвае адміністратар.

— А якая паміж імі розніца?

— У нумары за 30 франкаў ёсць пастка для мышэй.

●

Гэта праўда, што ты ажаніўся вельмі рамантычным спосабам — украў сваю будучую жонку?

— Праўда.

— А яе бацькі не наладжвалі пагоню?

— Наладжвалі.

— І не дагналі?

— Дагналі і цяпер жывуць у нас...

●

— Рыба, якую я ўчора купіла ў вашым магазіне, была нясвежая.

— Дзіўна, яна ж проста з мора.

— У такім выпадку яна, напэўна, ішла адтуль пешшу.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-07-82, 33-65-84. 33-03-15, 33-65-91, 33-15-15.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. № 1528.